**РЭЗАЛЮЦЫЯ ДЭМАКРАТЫЧНЫХ СІЛ БЕЛАРУСІ**
**да Канферэнцыі «Новая Беларусь» 2026**

# АБ ПАДТРЫМЦЫ НЕЗАЛЕЖНЫХ БЕЛАРУСКІХ МЕДЫЯ

8–9 жніўня, Варшава

**Мы, беларускія дэмакратычныя сілы**,

адзначаем, што незалежныя беларускія медыя (арганізацыі, праекты, блогеры, што ствараюць грамадска-палітычны кантэнт) з’яўляюцца неабходнай умовай доступу грамадства да праверанай інфармацыі, свабоднай публічнай дыскусіі і падсправаздачнасці ўлады і палітычных інстытутаў.

Пасля 2020 года рэжым Лукашэнкі амаль цалкам знішчыў свабодную журналістыку ўнутры краіны. Дзясяткі рэдакцый былі ліквідаваныя, сотні журналістаў апынуліся ў турмах або ў выгнанні. Нягледзячы на гэта, беларускія незалежныя медыя працягваюць інфармаваць беларусаў, дакументаваць рэпрэсіі, парушэнні правоў чалавека, карупцыю і іншыя злоўжыванні, якія маюць грамадскае значэнне, захоўваць беларускую мову і культуру, падтрымліваць сувязь паміж беларусамі ў краіне і за мяжой, а таксама супрацьстаяць прапагандзе.

Сёння, пасля скарачэння міжнароднай дапамогі, незалежныя медыя апынуліся пад пагрозай згортвання дзейнасці, страты прафесійных каманд або нават закрыцця. Іх падтрымка — гэта не толькі абарона свабоды слова, але і інвестыцыя ў будучую дэмакратычную Беларусь, а таксама ва ўстойлівасць еўрапейскай інфармацыйнай прасторы да аўтарытарнай прапаганды і дэзынфармацыі.

**Мы заклікаем міжнародных партнёраў**:

- Прызнаць устойлівасць незалежных беларускіх медыя адным з неабходных элементаў міжнароднай палітыкі падтрымкі дэмакратычнай Беларусі.
- Забяспечыць доўгатэрміновае інстытуцыянальнае фінансаванне беларускіх незалежных медыя, што павінна забяспечваць фінансавую ўстойлівасць пры безумоўным захаванні рэдакцыйнай незалежнасці.
- Павялічыць інвестыцыі ў лічбавую бяспеку, новыя тэхналогіі і бяспечныя каналы распаўсюду інфармацыі, каб беларусы працягвалі мець доступ да незалежных крыніц.
- Падтрымліваць расследавальную журналістыку і праекты, якія выкрываюць карупцыю, рэпрэсіі, абыход санкцый і ўдзел рэжыму ў расійскай вайне і іншыя пытанні істотнага грамадскага інтарэсу.
- Развіваць супрацоўніцтва беларускіх і еўрапейскіх медыя, праграмы абменаў і падрыхтоўкі новага пакалення журналістаў.

- Забяспечыць прававую, сацыяльную, псіхалагічную і бяспекавую падтрымку журналістаў і іх сем’яў, у тым ліку праграмы экстранай дапамогі, легалізацыі і рэлакацыі.
- Забяспечыць беларускім незалежным медыя доступ да еўрапейскіх праграм падтрымкі інфармацыйнай устойлівасці, даследавання дэзынфармацыі і прафесійнага супрацоўніцтва пры захаванні іх рэдакцыйнай самастойнасці.

Устойлівыя і рэдакцыйна незалежныя беларускія медыя неабходныя для доступу грамадства да праверанай інфармацыі, захавання свабоднай публічнай дыскусіі, беларускай мовы і культуры, супрацьдзеяння прапагандзе і пабудовы дэмакратычнай Беларусі.

*Офіс Святланы Ціханоўскай,*
*Аб’яднаны Пераходны Кабінет,*
*Каардынацыйная Рада,*
*Платформа палітычных партый*